Жыве Беларусь!

Народная Газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№22 (787) 2 лютага 1994 г. Серада. Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах. Тыраж 602508 экз. Кошт у розніцу — 50 руб.

ФАКС

К нам едут эксперты

Сегодня в Минск прибывает большая группа экспертов из министерств финансов, экономики, таможенного комитета, Госкомсотрудничества, Центрального банка России.

Вместе с белорусскими коллегами им предстоит подготовить к подписанию последние из большого пакета документов, необходимых для объединения денежных систем двух стран.

Как сообщил один из членов белорусского Кабинета министров, пожелавший остаться неизвестным, стороны близки к согласию о необходимости переходного этапа, во время которого предстоит выработать единые подходы в таможенной, бюджетной, ценовой, кредитной и социальной политике. Он не исключил, что будет принято предложение о постепенной, в течение полугода или года, замене наличных "зайчиков" российскими рублями.

Пока сам себя не защитишь...

В ближайшие дни в Могилеве состоится ассамблея частного бизнеса области.

Цель — консолидировать предпринимателей Могилевщины и выработать правовой механизм защиты их интересов.

Николай ЗАПОЛЬСКИЙ.

Из армии — в отставку, из политики — "вперед ногами"

Памятный многим по телерепортажам со съездов народных депутатов СССР уроженец Гомельской области, неугомонный полковник Николай Петрушенко прописался с семьей на Витебщине.

Он строит дом в поселке Коханово близ Толочина. Жена работает медсестрой, старший из трех сыновей — в совхозе.

Получение белорусского гражданства позволило Николаю Семеновичу вернуться в политику, откуда теперь, как явствует из интервью газете "Віцебскі рабочы", его можно убрать "только вперед ногами". Став членом республиканской компартии, Петрушенко вместе с ней вошел в блок "Народное движение Беларуси". Он считает БНФ серьезным противником на предстоящих выборах, но полагает, что они "не внесут коренных изменений в расстановку политических сил".

Сергей ДВИНСКИЙ.

Спорт-экспресс

Валерий Салов (Россия) — Ян Тимман (Голландия), Вишванатан Ананд (Индия) — Гата Камский (США) и Владимир Крамник (Россия) — Борис Гельфанд (Беларусь) — вот пары гроссмейстеров, которые встретятся в июле на втором этапе соревнования претендентов на первенство мира по версии Международной шахматной федерации /ФИДЕ/.

❑

В канадском городе Калгари проходит чемпионат мира по конькобежному спорту. Белорусский конькобежец Игорь Железовский на дистанции 1000 метров был третьим.

❑

"Спортлото": результаты 5-го тиража /30 января/

"6 из 45": 12, 13, 27, 37, 44, 17

"5 из 36": 2, 12, 17, 34, 11

"6 из 56": 1, 11, 54, 14, 29, 16 плюс 15 /льготный/

❑

"Спортпрогноз": результаты 5-го тиража /28—30 января/

1—1, 2—1, 3—1, 4—2, 5—1, 6—х, 7—х, 8—1, 9—1, 10—1, 11—1, 12—1, 13—1.

Вкратце

17—20 февраля белорусский Фонд имени братьев Луцкевичей планирует провести в Минске международную научно-практическую конференцию "Основные вопросы социальной политики и хозяйствования в Беларуси и соседних странах".

❑

Министр обороны России Павел Грачев прибудет сегодня в Тбилиси.

В пресс-центре Группы российских войск в Закавказье отказались прокомментировать то обстоятельство, что министр прибывает в Грузию не с официальной делегацией России, которую возглавляет Б.Ельцин, а на день раньше.

❑

Десятку популярнейших политиков Литвы в январе, как и прежде, возглавил президент республики Альгирдас Бразаускас.

Итоги проведенного в январе литовско-британской компанией "Балтийские исследования" опроса общественного мнения показали, что рейтинг президента — 58 баллов. Это на 4 пункта меньше по сравнению с предыдущим месяцем.

❑

Председатель Верховного Совета Крыма Николай Багров подал в отставку.

Президиум решил провести 4 февраля заседание Верховного Совета Крыма. Ожидается, что во время сессии парламента пройдет церемония инаугурации избранного на днях первого президента Крыма — Юрия Мешкова.

❑

В МИД России ведется подготовка к консультациям с руководством НАТО по вопросу о присоединении России к программе "Партнерство во имя мира".

В ходе консультаций российская сторона намерена "выявить конкретную позицию высшего руководства НАТО по отношению к России и определить параметры заключаемых соглашений".

❑

Государственный советник Азербайджана по внешнеполитическим вопросам Вафа Гулузаде высказал мнение, что в условиях оккупации одной пятой территории Азербайджана ни о каких мирных переговорах с армянами "речи быть не может".

Госсоветник подчеркнул, что вооруженные силы Армении должны быть выведены со всей территории Азербайджана, в том числе из Нагорного Карабаха.

❑

Президент Казахстана Нурсултан Назарбаев сообщил, что в ближайшее время между Москвой и Алматы намечено подписание договора о военном сотрудничестве.

Он отметил, что текст документа "фактически согласован".

❑

В районе 12-й заставы Пянджского погранотряда в понедельник предотвращена очередная попытка боевиков таджикской оппозиции нелегально перейти из Афганистана в Таджикистан.

На участке 12-й заставы Московского погранотряда с тыла был обстрелян пограничный наряд.

❑

Курс доллара на торгах Московской межбанковской валютной биржи вчера вновь вырос и составил 1560 рублей за 1 доллар США.

Владимир Егоров: "В принципе выдача законна"

Самая популярная литовская газета "Летувас ритас" опубликовала интервью с бывшим министром внутренних дел Беларуси Владимиром Егоровым.

В.Егоров, в частности, сказал, что наказание его Верховным Советом совсем неадекватно поступку. "В таком случае нужно было отстранить от должности и Генерального прокурора Беларуси, так как без его согласия я не мог предпринять такие действия", — заметил Егоров. Свою ошибку он видит только в том, что решение задержать и передать Литве руководителей коммунистической партии Литвы М.Бурокявичюса и Ю.Ермалавичюса было принято без письменного разрешения Генерального прокурора, а только по его устной санкции. "В принципе, — подчеркнул Егоров, — выдача законна. Если и были нарушения, то только процессуальные".

Андрей КОРСАК.



Рисунок Олега ПОПОВА.

"За" и "против" Егора Гайдара

Фракция "Выбор России" в Государственной думе, возглавляемая бывшим первым вице-премьером Егором Гайдаром, выступила против предстоящего объединения денежных систем России и Беларуси, назвав его "поспешным и неподготовленным".

"В нынешнем виде межбанковское и межправительственное соглашения неизбежно повлекут, как показал расчет, огромные экономические потери для России, новый виток инфляции, резкое падение жизненного уровня россиян", — говорится в заявлении фракции.

Вместе с тем в нем подчеркивается, что "Выбор России" — "за экономическую интеграцию России с Беларусью и другими республиками бывшего СССР, но на четких и ясных принципах".

Отчего я веселый такой... Работаю!

В обычное расписание президента Российской Федерации Б.Ельцина вчера были оперативно внесены несколько поправок, с тем чтобы дать возможность главе государства принять поздравления с днем рождения прямо на рабочем месте в Кремле.

Как сообщили в пресс-службе президента Российской Федерации, никаких официальных мероприятий в связи с 63-летием Ельцина не было предусмотрено.

Вчера президент как обычно принял ряд высших государственных чиновников по текущим вопросам. Он также продолжает подготовку к намеченному на завтра своему официальному визиту в Грузию.

Рушится еще один айсберг


Не успели высохнуть, как говорят, чернила на указе российского президента о расформировании айсберго-тоталитарного советского режима — КГБ, как уже на очереди кардинальное реформирование второго социалистического монстра — МВД.

На столе у президента Б.Ельцина ожидает подписи указ о создании на базе этих правоохранительных структур новых служб, независимых друг от друга, по защите безопасности россиян. По опыту цивилизованных государств теперь в России будут действовать федеральная, муниципальная, дорожная милиция и национальная гвардия. Федеральную милицию и гвардию предполагается подчинить непосредственно президенту Российской Федерации.

Леонид ФАДЕЕВ.

Выпуск подготовлен по сообщениям корреспондентов "Народной газеты", агентств ИТАР—ТАСС, Белинформ, Интерфакс, БелаПАН.

Ракурс



Дрэвы. Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Журналіст вярнуўся з прэс-канферэнцыі

Мячэслаў ГРЫБ:

"Змена кіраўніка парламента не азначае змену палітычнага курсу краіны"

Сямён ЛУКАШУК

Учора адбылася прэс-канферэнцыя Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Мячэслава Грыба. У самым яе пачатку Мячэслаў Іванавіч выказаў шчырую падзяку грамадзянам Беларусі і кіраўнікам краін СНД, якія павіншавалі яго з абраннем на пасаду Старшыні Вярхоўнага Савета Беларусь. Потым заявіў, што змена кіраўніка парламента не азначае змену палітычнага, эканамічнага курсу, курсу рэформ, па якім ідзе сёння Рэспубліка Беларусь. Мір, добрасуседскія адносіны з усімі дзяржавамі, з усімі суседзямі, прызнанне межаў, у якіх мы існуём, сказаў Мячэслаў Грыб, — вось галоўныя знешнепалітычныя прыярытэты, вызначаныя нашым Вярхоўным Саветам.

— Я буду паслядоўна прытрымлівацца курсу на бяз'ядзернасць і нейтральнасць, абвешчаную нашым парламентам. Вярхоўны Савет будзе рабіць усё для таго, каб наша краіна стала цывілізаванай дзяржавай і была дастойна прадстаўлена ў сусветным супольніцтве. Унутрыпалітычнае жыццё, безумоўна, будзе накіравана на будаўніцтва суверэннай дзяржавы, стварэнне ўмоў для нацыянальнага адраджэння, захаванне стабільнасці ў грамадстве. У бліжэйшы час Вярхоўны Савет павінен вызначыць форму дзяржаўнага ладу на Беларусі — быць нашай рэспубліцы прэзідэнцкай або парламенцкай. Вярхоўны Савет будзе рабіць усё для таго, каб забяспечыць больш дынамічны пераход рэспублікі да рынку. І няхай ніхто не лічыць, што рэспубліка пойдзе на адкат ад рэформ. Гэта сёння немагчыма, недапушчальна ні з палітычнага, ні з эканамічнага пункту гледжання. І ніякія сілы не змогуць збіць нас з выбранага намі шляху. Але пры гэтым нельга дапусціць далейшага зніжэння жыццёвага ўзроўню насельніцтва. Неабходна і Вярхоўнаму Савету, і ўраду, і мясцовым Саветам з вялікай адказнасцю заняцца структурнай перабудовай нашай эканомікі, ажыццяўленнем прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці.

На пытанне, якімі будуць першыя крокі новага Старшыні Вярхоўнага Савета, Мячэслаў Грыб адказаў:

— Мы плануем правесці першы Прэзідыум Вярхоўнага Савета разам з урадам, на якім разгледзім неадкладныя меры па забеспячэнню пасяховай сяўбы, прымем неабходныя захады для актывізацыі дзейнасці нашых прадпрыемстваў. Гэта вельмі важнае пытанне, і зараз мы яго яшчэ можам вырашаць, а заўтра ўжо будзе позна. Сеяць трэба тады, калі трэба. А калі спознішся на дзень, то і жаць не будзе чаго.

Журналістаў таксама цікавіла, хто з замежных палітыкаў павіншаваў Мячэслава Грыба з абраннем на пасаду Старшыні Вярхоўнага Савета Беларусі, ці плануюцца кадравыя змены ва ўрадзе і Вярхоўным Савеце. Мячэслаў Іванавіч сумленна прызнаўся, што тэлеграм з далёкага замежжа ён пакуль што не атрымліваў, што ён будзе прыкладаць усе намаганні, каб як мага хутчэй выбраць намеснікаў Старшыні Вярхоўнага Савета. Што датычыць кадравых змен ва ўрадзе, то Мячэслаў Грыб чакае прапановы ад Старшыні Савета Міністраў...

Крымінальны гром

З мяккай мэблі — на жорсткія нары?

Мікалай АЧЫЖА

Учора народныя дэпутаты Рэспублікі Беларусь прагаласавалі за тое, каб прыпыніць паўнамоцтвы суддзі Першамайскага раёна горада Бабруйска Міхаіла Клопава і старшыні Барысаўскага гарадскога суда Эдуарда Храмянкова. Дадзена таксама згода на ўзбуджэнне крымінальнай справы супраць іх і арышт.

Канешне, калі следства дакажа іх віну, то суддзі будуць судзімы сваімі калегамі ў народным судзе. І толькі тады іх можна будзе назваць злачынцамі. А пакуль што мы праінфармуем аб тым, у чым яны падазраюцца.

У поле зроку праваахоўных органаў трапіў жыхар Бабруйска Міхаіл Эрэнбург. Яго крымінальны профіль кваліфікаваны як махлярства і падбухторванне на дачу хабару.

Эрэнбург арыштаваны. Расследаванне справы прывяло да таго, што ў лік саўдзельнікаў трапілі і названыя вышэй суддзі. Адпаведныя службы правялі аператыўныя мерапрыемствы — у выніку атрыманы доказы іх віны.

У старшыні Барысаўскага суда Эдуарда Храмянкова знойдзена 4215 долараў ЗША, 500 марак ФРГ, чатыры замежныя відэасістэмы, 15 аўташын, мяккая мэбля, каля тысячы пляшак гарэлкі.

У Міхаіла Клопава лепш атрымлівалася са збіраннем расійскіх рублёў (600 тысяч) і родных беларускіх "зайчыкаў". Мяркуецца, што хабар ён браў таксама парфумнымі наборамі, відэаапаратурай. Выклікала сумненне ў работнікаў пракуратуры і чысціня двух набытых аўтамабіляў (аднаго айчыннага, другога імпартнага).

Васіль Шаладонаў падкрэсліў, што ў дзеяннях суддзяў выяўлена прамая залежнасць паміж хабарам і змякчэннем прыгавораў.

На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Думай пра выбары, дэпутат

Мікалай ГАЛКО

Не намі заведзена: прыход новага чалавека на значную пасаду, незалежна ад сімпатый альбо антыпатый, выклікае хваляванне, адразу ўзнікаюць пытанні: а ці на многае ён здольны, якім будзе першы крок, ці пад сілу яму ўзняцца вышэй будзённых дробязей?

Учора ў новага Старшыні Вярхоўнага Савета Мячэслава Грыба быў прэм'ерны дзень — менавіта гэтая акалічнасць паклікала ў залу аматараў і прафесіяналаў палітычнай кухні, якія запоўнілі нават усе дадатковыя месцы.

Мячэслаў Грыб адкрыў ранішняе пасяджэнне наступнай кароткай прамовай:

Добрай раніцы, паважаныя народныя дэпутаты!

Перад тым, як пачаць работу сесіі, дазвольце мне яшчэ раз выказаць падзяку за аказаны мне давер і заверыць вас усіх — і тых, хто аддаў свае галасы за мяне, і тых, хто галасаваў супраць ці зусім не прымаў удзел у галасаванні, што буду прыкладаць усе намаганні, каб работа Вярхоўнага Савета была канструктыўнай і плённай.

Звяртаючыся да апазіцыі, хачу нагадаць, што толькі сумеснымі намаганнямі мы выйдзем з гэтага цяжкага становішча, у якім усе апынуліся. Я не заклікаю да аднагалоснасці, але я супраць крытыкі дзеля крытыкі. Я заклікаю на справе, а не на словах паказаць і даказаць, што мы заклапочаны лёсам народа. Нас выратуе толькі кансалідацыя, а не канфрантацыя. Важную і пачэсную ролю ў аб'яднанні людзей, у паслабленні грамадскай напружанасці могуць і абавязаны выканаць сродкі масавай інфармацыі. Няхай пяро будзе вострым, але сумленным!

Дарагія суайчыннікі!

Мяне выбралі Старшынёй Вярхоўнага Савета ў вельмі складаны час.

Ведаючы цяжкае становішча інвалідаў, пенсіянераў, мнагадзетных сем'яў, студэнтаў, вайскоўцаў, сялян, рабочых і навукоўцаў, усіх сацыяльных слаёў грамадскасці, я не буду пачынаць сваёй працы з безадказных абяцанак.

Абяцаю толькі адно: заўсёды помніць, што за мной — дзесяцімільённы працавіты, шчыры беларускі народ, які заслугоўвае лепшай долі.

Я прыкладу ўсе намаганні, каб як мага хутчэй палепшылася жыццё кожнага чалавека, кожнай сям'і.

Я спадзяюся на ваша разуменне, вашу грамадскую мудрасць, я звяртаюся да вас і прашу вашай дапамогі, падтрымкі і спагады.

Лёс нашай Беларусі, нашай Бацькаўшчыны — у нашых руках!

Што датычыцца адносін Беларусі з замежнымі краінамі, то яны будуць працягвацца і будавацца на вынове ўзаемнай выгады і павагі, добрасуседства і супрацоўніцтва.

У стане апазіцыі БНФ прамова Старшыні калі і знайшла водгук, то хутчэй за ўсё адмоўны, бо Галіна Сямдзянава выкарыстала тры хвіліны ў "Розным", каб зрабіць рэзкую выснову аб тым, што трэці Старшыня Вярхоўнага Савета ў гэтым скліканні, можа здарыцца, стане першым генерал-губернатарам беларускай правінцыі.

Што ж, і Мячэславу Грыбу прыйдзецца неаднойчы паспытаць, што такое парламенцкі плюралізм на практыцы. А выказвацца нашы дэпутаты ўмеюць, як левыя і правыя, так і тыя, хто б'е па цэнтры.

Пасля таго, як старшынствуючы абвясціў, што нарада членаў Прэзідыума рэкамендуе для сесіі дзённае "меню" з даволі прэсных страў (пытанні аб дзяржаўнай падатковай інспекцыі, аўдытарскай дзейнасці, фондзе садзейнічання занятасці і г.д.), частка дэпутатаў перайшла ў рашучы наступ.

Уладзіміра Новіка ўсхвалявала, чаму дэпутаты не маюць аніякай інфармацыі аб стане перамоў з Расіяй пра аб'яднанне грашовых сістэм. Яны вядуцца за зачыненымі дзвярыма, імёны ж тых экспертаў, што рыхтуюць фінансавае вянчанне, невядомы.

Канечне, пытанне з разраду найбольш важных. Але дэпутатаў супакоіла паведамленне старшыні Нацыянальнага банка Станіслава Багданкевіча, што чакаецца прадстаўнічая дэлегацыя з Масквы (адных намеснікаў міністраў будзе аж восем). І наш бок выставіць тытулаваную зборную. Якім будзе лік: 1:1, 1:6, 1:10? Пачакаем, лік — гэта ж няпроста, бо напрамую паўплывае на змест нашых кашалькоў, якія па форме сталі тоўстымі, а па сіле кволымі.

Была і другая прапанова — не спяшацца з разглядам пенсіённага заканадаўства. Яно вельмі важнае, яно павінна абараняць ад поўнага жабрацтва 2,5 мільёна пенсіянераў, таму, на думку дэпутата Уладзіміра Шаўцова, трэба дэталёва вывучыць усе прапановы, а не вырашаць праблему наскокам, бы ўзмахам шаблі.

Зразумела, першы дзень не змог не ўзрушыць тых дэпутатаў, якія ўжо не могуць абысціся без палітыкі, як і палітыка без іх. Цяпер, калі да мікрафона набліжаецца Аляксандр Лукашэнка, зала прыціхае. І на гэты раз Аляксандр Рыгоравіч у моцных выразах заклікаў стрэсці з сябе вяласць, не цешыць сябе і не пацяшаць іншых, бо другарадныя праблемы дадуць дробныя вынікі альбо не дадуць нічога. Лукашэнка заклікаў М.Грыба ўзяць на сябе цяжкі груз адказнасці, прыспешыць выбары, як прэзідэнцкія, так і парламенцкія, бо інакш, як сказаў Аляксандр Рыгоравіч, "нам усім будзе хана". Пакуль, на думку Лукашэнкі, Прэзідыум прапанаваў абмеркаваць "кучу хламу". Усе гавораць пра выбары, рэдка хто асуджае гэтую дэмакратычную ідэю, але вырашэнне высакароднай палітычнай акцыі ўсё яшчэ закапана ў шуфлядах чыноўніцкіх сталоў, у паперах.

Дзе яны, тыя выбары? Якую дату нам абвесці чырвоным алоўкам? Зразумела, што колішняе абяцанне правесці выбары ў сакавіку ўжо не ўдасца ўвасобіць у жыццё. Дэпутаты ціхенька высушылі яго і адправілі ў парламенцкі гербарый.

Анатоль Лябедзька з гэтай нагоды зрабіў чорна-карычневы прагноз: не будзе выбараў — з'явіцца камітэт нацыянальнага выратавання і многім дэмакратам прыйдзецца вучыцца выконваць вайсковыя каманды.

Палітычныя дэмаршы, аднак, не далі станоўчага выніку. Праўда, Мячэслаў Грыб абяцаў, што ўсё заўважана, усё будзе вывучана — а вырашаць справу электронныя кнопкі...

Далей пачалося паартыкульнае галасаванне розных законапраектаў. Не хапіла галасоў для прыняцця змен у Законе аб падатковай дзяржаўнай інспекцыі.

Рэзкая супярэчлівасць думак і пазіцый выявілася пры абмеркаванні пытання аб выкарыстанні знешняй пазыкі. Дарэмна прыводзілі аргументы на карысць урадавай пазіцыі намеснік міністра фінансаў Мікалай Лісай, старшыня камісіі Раман Унучка, яго намеснік Сцяпан Пісарэвіч, народны дэпутат Міхаіл Марыніч. Агітаваў за станоўчае галасаванне і Мячэслаў Грыб. З імі спрачаліся Віктар Аляміеў, Віталь Малашка, Уладзімір Новік.

Двойчы галасавалі дэпутаты: першы раз не хапіла аднаго голасу, другі — ужо пяці...

Лёгка прайшло абранне старшынёй Канстытуцыйнай камісіі Мячэслава Грыба (195 галасоў "за").

З інфармацыяй аб крымінальных падзеях у судовым асяроддзі выступіў Генеральны пракурор Васіль Шаладонаў.

У другой палове дня дэпутаты абмяркоўвалі іншыя пытанні.

А што ў правінцыі?

Фірменны "Надомнік"

Уласны фірменны магазін адкрыў камбінат надомнай працы ў Шчучыне. Набыць тут можна дзесяткі назваў швейных вырабаў —ад пасцельнай бялізны і ручнікоў да спецвопраткі і кашуль.

Спецыяльна для сваіх кватэр шчучынцы заказваюць у "Надомніку" — так называецца магазін — шторы, фіранкі, іншыя патрэбныя рэчы. Каштуе ўсё гэта танней, чым нават у дзяржаўным гандлі. Таму што тут абыходзяцца без пасрэднікаў, а значыць, і нацэнак. Тканіны і іншыя матэрыялы камбінат, дзе занята 160 чалавек, атрымлівае па прамых сувязях, у тым ліку з краін блізкага замежжа.

Канстанцін БАЛАТЭВІЧ.

Падклалі свінню

Сальманелёз, дызентэрыя, бутулізм і іншыя небяспечныя захворванні толькі ў мінулым годзе на Віцебшчыне падкасілі прыкладна 4,5 тысячы чалавек. Ёсць нават смяротныя выпадкі.

Новы год прынёс новую напасць — у Расонскім раёне выяўлена масавае захворванне на трыхінелёз. Больш як чатыры дзесяткі чалавек паспыталі дамашняй каўбасы са свініны, заражанай трыхінамі. На сённяшні дзень у абласной бальніцы знаходзіцца 19 чалавек, трое з іх накіраваны ў Мінск, двое застаюцца ў расонскай бальніцы. Яшчэ за дваццацю жыхарамі пільна сочаць урачы — раптам праявіцца небяспечнае захворванне. Мяркуецца, што заражанымі былі некалькі жывёлін, якія і пайшлі на далікатэсы.

Сяргей НІКАНОРАЎ,
Белінфарм.

Ці чулі?

Фіксаваныя цэны пакуль што "зацугляныя"

Мы прывыклі ўжо да таго, што пачатак кожнага месяца суправаджаецца падаражаннем прадуктаў харчавання. Але, як запэўнілі ў дэпартаменце цэн пры Дзяржэканамплане рэспублікі, на гэты раз фіксаваныя цэны застануцца без змяненняў. А як доўга пратрымаюцца "ў цуглях" — залежыць ад многіх фактараў. Так што ў лютым мы зможам па ранейшаму кошту набываць асобныя сарты чорнага хлеба, малако і малочнакіслую прадукцыю, дзіцячае харчаванне і белую гарэлку. Што датычыць свабодных цэн на іншыя віды прадуктаў, то тут усё залежыць ад велічыні выдаткаў на іх вытворчасць.

Белінфарм.

Ва ўрадзе рэспублікі

Савет Міністраў прыняў рашэнне павялічыць у лютым размер даплаты да мінімальных працоўных пенсій, прадугледжанай урадавай пастановай ад 22.07.93 г. нумар 497 "Аб чарговых мерах па сацыяльнай абароне насельніцтва", з 40 да 60 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросту. Расходы намечана ажыццявіць за кошт сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.

❑

Прынята рашэнне павялічыць з 1 студзеня размеры дапамог і даплат, прадугледжаных артыкуламі 30, 33, 37 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС", у 1,5 раза ў параўнанні з зацверджанымі пастановай Саўміна ад 8.12.93 г. нумар 828 "Аб размерах дапамог і даплат насельніцтву, якое пацярпела ў выніку чарнобыльскай катастрофы".

Рэпарцёр даведаўся

Па нямецкай тэхналогіі

У Віцебску, які славіцца прадукцыяй вядомага не толькі ў рэспубліцы, але і за яе межамі прадпрыемства "Белвест", з'явілася новая абутковая вытворчасць. Яе арганізавалі мясцовы завод "Эвістар" і фірма "ЛМ плюс МК".

Канкурэнт "Белвеста" і мясцовай фабрыкі "Чырвоны кастрычнік" будзе выпрабляць мужчынскі абутак па тэхналогіі нямецкай фірмы "Саламандэр". Ужо ў гэтым годзе прадпрыемства збіраецца абуць трыста тысяч суграмадзян. Частка прадукцыі пад назвай "Марко" пойдзе ў Заходнюю Еўропу і Расію.

Белінфарм.

Прашу слова!

Не трэба выступаць ад нашага імя...

Часта даводзіцца чуць па радыё выступленні дэпутатаў ад ветэранскіх арганізацый, накіраваныя супраць беларускай мовы, супраць нашай спрадвечнай сімволікі. І гаворыцца гэта быццам бы ад імя ўсіх ветэранаў Беларусі.

Мая жонка, мае сябры, мае знаёмыя, я маем медалі "Ветэран працы", але ніхто з нас не жадае знішчэння роднай мовы, замены нашай спрадвечнай сімволікі.

Дык каго ж прадстаўляюць ветэраны, якія так ненавідзяць усё беларускае?

Вельмі просім з трыбуны Вярхоўнага Савета, са старонак "Народнай газеты" паведаміць, што ні мы, ветэраны працы, ні ветэраны вайны не даручалі ім ганьбіць усё наша, роднае, беларускае і выступаць ад нашага імя за знішчэнне суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

Алесь БЕЛАКОЗ,
дэпутат Гродзенскага абласнога Савета народных дэпутатаў.

Конверсия



Еще недавно объединение "Интеграл" в основном было известно благодаря часам "Электроника". Основная же продукция в целях конспирации именовалась расплывчато — полупроводниковые приборы. И в этом нет ничего удивительного: предприятие работало на космос и оборону. Здесь создавались изделия, принесшие стране мировую славу.

Сейчас разработки "Интеграла" нацелены на широкое применение в народном хозяйстве. Продукцией этого предприятия уже оснащены и мощный комбайн "Дон", и фотокамера "Эликон". Дистанционное управление телевизоров "Горизонт", "Витязь" сработано специалистами "Интеграла". Интересные разработки по применению жидко-кристаллических индикаторов ведут инженеры СКБ "Немига". Освоение выпуска этих индикаторов на предприятии позволит создавать компьютеры и телевизоры с плоским экраном.

Уровень разработок "Интеграла" чрезвычайно высок. Это подтверждает и тот факт, что им интересуются многие зарубежные фирмы, в том числе из таких стран, как Япония, США, Германия.

◘ Инженеры СКБ "Немига" Виктор Гереник (справа) и Александр Березовик за разработкой изделий с применением жидко-кристаллических индикаторов.

Фото Александра ТОЛОЧКО,
Белинформ.

Прямая речь

"Поскромнее надо быть, господа, и не поднимать на щит то, чего нет"*

25 января на утреннем заседании сессии Верховного Совета в разделе "Разное" прозвучало выступление депутата от Белорусской республиканской организации ветеранов войны и труда Н.И.Журавлева, посвященное одной из статей "Народной газеты". Публикуем его:

"Уважаемые народные депутаты, уважаемый Президиум! Выступить меня заставила опубликованная статья в "Народной газете" под названием "Бомбоубежище". Не будем спорить о проекте постановления Совета Министров о пенсиях за особые заслуги. Постановление, возможно, требует доработки, уточнений, это другое дело. Устанавливать такие пенсии, за особые заслуги людям надо. Принимать постановление необходимо. Но не может не возмутить отношение обозревателя "Народной газеты" Крапивина, когда он незаслуженно оскорбляет ветеранов войны, труда, военнослужащих армии и даже мам и пап, производящих на свет детей. Кого хотят загнать в бомбоубежище главный редактор и обозреватель "Народной газеты"? За неимением времени остановлюсь на трех вопросах.

Первое. Ветеранов войны, героев войны, героев труда, которые в годы войны ежеминутно смотрели смерти в глаза, находясь на передовой перед врагом по освобождению республики, а после войны восстанавливали разрушенные города, села, фабрики и заводы.

Второе. Незаслуженно обвиняют в статье офицеров армии, оценивают их как бездельников. На учении всю ночь только и играют в преферанс. Откуда такая информация? А кто же занимается воспитанием солдат, сержантов? Теперь об ордене "За службу". Им, пишет обозреватель, награждаются офицеры последовательно по званиям и должностям. Хотя бы уточнили в Министерстве обороны. Для сведения сообщу. Данным орденом Советской Армии бывшего Союза награждено всего 11 офицеров, и ни один из них не проживает в Республике Беларусь. Выходит, что хочу, то и пишу.

Третье. Обозреватель "Народной газеты" Крапивин пишет, что белорусские мамы и папы производят на свет девочек и мальчиков с более длинными руками и ногами, и они впоследствии становятся чемпионами мира, Европы и Олимпийских игр. Хочется спросить обозревателя газеты: так вы хотите, чтобы было больше недоразвитых? По-моему, на шее правительства их достаточно. Если вы не хотите признавать белорусских чемпионов, то весь мир их признает.

Уважаемые народные депутаты, уважаемый Станислав Станиславович, уважаемый Вячеслав Францевич, я считаю, чтобы прекратить оскорбление заслуженных людей в правительстве, прошу рассмотреть вопрос о персональных пенсиях на совместном заседании Президиума Верховного Совета и Президиума Совета Министров и принять решение, чтобы в дальнейшем не было таких выступлений в прессе, на митингах и собраниях. Спасибо за внимание".

Текст этого выступления в виде отдельной распечатки редакция дополнительно получила из секретариата тринадцатой сессии Верховного Совета Республики Беларусь. В официальном сопроводительном письме за подписью руководителя секретариата М.А.Маринича сказано: "Направляются предложения и замечания народного депутата Республики Беларусь Журавлева Н.И. О результатах рассмотрения просим сообщить народному депутату и Верховному Совету Республики Беларусь".

Редакция рассмотрела высказанные предложения и замечания. Формой ответа избран комментарий обозревателя Сергея КРАПИВИНА.

Статья "Бомбоубежище" была опубликована 9 декабря минувшего года. С начала нового года у "Народной газеты" прибавилось 100 тысяч подписчиков — по сути, взросло население крупного города, — и этим людям необходимо объяснить, в чем, собственно, дело.

Прежде всего отметим, что народный депутат Н.И.Журавлев существенно обмолвился, когда призвал не спорить о проекте постановления Совета Министров о пенсиях за особые заслуги.

Это не проект. Это именно постановление. Принято оно 30 марта 1993 года, получило номер 185 и официальное название "Об утверждении положения о пенсиях за особые заслуги перед Республикой Беларусь".

Если постановление имеет подписи премьера и управделами Совета Министров, то укрытое под его сенью положение как бы анонимно. Как бы само собой, нечестными произошло оно в недрах аппарата Совмина, словно вследствие каких-то возможных споров в народной среде, в среде народных избранников. Но спорить необходимо, потому что это есть не что иное, как дурно замаскированная попытка старой партийно-чиновничьей номенклатуры возродить былые пенсионные, бытовые и медицинские привилегии.

Из пункта 4 положения о спецпенсиях:

"Размер указанной пенсии определяется в зависимости от заслуг лица, которому она назначается, степени утраты трудоспособности, а также с учетом размера трудовой пенсии, начисленной согласно действующему пенсионному законодательству. При этом пенсия за особые заслуги перед Республикой Беларусь устанавливается в размере пенсии по возрасту или инвалидности с повышением ее на 100—200 процентов минимального размера пенсии по возрасту."

А кроме того, предусмотрены еще и льготы (скидка на 50 процентов) по квартплате и в приобретении топлива, бесплатное протезирование, бесплатные санаторные путевки и проезд в пределах Беларуси раз в году.

Тут стоит задаться принципиальным вопросом: нужны ли вообще пенсионные и иные льготы отдельным категориям граждан? Нужны, считаем мы. На то есть, к примеру, Закон Республики Беларусь от 17 апреля 1992 г. "О пенсионном обеспечении". Согласно статьям 1—22, предусмотрены пенсии, назначаемые на льготных условиях (при пониженном возрасте или сокращенном стаже) в зависимости от условий труда, семейного положения и состояния здоровья. Категорически поддерживаем статью 68 Закона, которая в качестве компенсации за особый характер общественно полезной деятельности предусматривает повышение пенсий. Круг лиц, имеющих право на повышение, достаточно широк. Среди них есть и участники войны, и лица, работавшие в блокадном Ленинграде, и узники фашистских концлагерей, и граждане, награжденные орденами и медалями СССР за самоотверженный труд и безупречную воинскую службу в годы Великой Отечественной войны.

А теперь догадайтесь, кто в Законе не упомянут?.. Правильно: люди, которые за Родину не воевали, под пули не лезли, а были "просто" начальниками или их обласканно-олауреаченными приближенными. Теми, кому в прежние времена согласно особым инструкциям ЦК и Совмина назначались так называемые персональные пенсии союзного и республиканского значения.

Вот потому-то, действуя вне рамок единого Закона, сознательно превышая свои полномочия, Совмин сотворил документ, где, например, сказано:

"1.Пенсии за особые заслуги перед Республикой Беларусь устанавливаются:

...народным депутатам Республики Беларусь, избранным начиная с двенадцатого созыва Верховного Совета;

членам Президиума Верховного Совета и Президиума Совета Министров Республики Беларусь, членам правительства, председателям Комитета государственной безопасности, правления Белкоопсоюза, Верховного суда, Высшего хозяйственного суда, Контрольной палаты, Федерации профсоюзов Беларуси, Генеральному прокурору, начальнику Секретариата Верховного Совета, председателям облисполкомов и Минского горисполкома при уходе на пенсию, в отставку, по окончании полномочий (в том числе досрочном)".

Как видим, это возводится в государственный принцип — назначать спецпенсии и сопутствующие привилегии по формальным признакам, по фактам воздвижения на определенные этажи иерархической пирамиды. Вот она — наконец-то оглашенная табель о рангах.

И тем не менее народный депутат Н.И.Журавлев призывает не спорить с постановлением Совмина. У него, стоящего на самой высокой в стране трибуне, не возникает желания высказаться, например, по поводу 18-го пункта положения о спецпенсиях:

"Лица, получающие пенсию за особые заслуги перед Республикой Беларусь, и члены семей этих лиц, находящиеся на их иждивении, имеют преимущественное право на медицинскую помощь и бесплатное протезирование всех видов (за исключением протезирования из драгоценных металлов) в учреждениях охраны здоровья, к которым были прикреплены в период работы (службы). Этими же правами пользуется жена (муж) пенсионера, получающего пенсию за особые заслуги перед республикой, не находящаяся на его иждивении".

...Есть классический пример того, как начальствующий в столице зять ублажает за государственный счет живущую в деревне тещу: подводит к ее усадьбе асфальтовую дорогу, газ, телефон, водопровод. Делать это только для одного человека ему было бы нельзя — скажут, что злоупотребляет служебным положением. И тогда посредством аппаратных ходов вдруг вся деревня объявляется образцово-показательной. Лично для зятя это ничего не стоит — средства-то государственные. И в результате односельчане, сглодав брошенную кость, помалкивают. А некоторые и нахваливают начальника-благодетеля. И очень трудно кому-нибудь из них возвысить голос по поводу того, что благодеяние это совершено за счет окрестных сел.

Так вот, роль односельчан номенклатурной тещи, роль цементирующе-прикрывающей массы отведена в постановлении Совмина лауреатам, орденоносцам, мировым и европейским чемпионам. А ну-ка попробуй выступи против святой этой рати!

Ход простой и эффективный: спрессовать в общий ком очень разных людей, повязать их круговой порукой, измазать всем губы жиром. Ковырни-ка теперь этот конгломерат — выпустят на трибуну ветерана-орденоносца, который размахнется да как даст себя кулаком в грудь!..

А что думают обо всем этом граждане, которых Совмин не облагодетельствовал?

Письмо читательницы из Минска:

"Уважаемый тов. С.Крапивин!

Спасибо за статью "Бомбоубежище". Оказывается, особые заслуги имеют даже жены номенклатуры. Интересно за что — за общую кровать?

А депутаты Верховного Совета, с помощью которых республика докатилась до экономического кризиса? За нищету большинства населения? Вот поистине "особые" заслуги!

Некий "большой знаток" порядка награждения воинов Великой Отечественной войны росчерком пера в положении о спецпенсиях определяет, что для признания особых заслуг участникам войны нужно иметь не менее 5 орденов мужчинам и 3 орденов женщинам. Он, видимо, думает, что на войне ордена раздавались налево и направо?

Если кто и имеет такое количество, так это преимущественно штабники и генералы, которые стояли у орденской кормушки. Не забывали они и своих "полевых жен". Обычные же труженики войны — солдаты, фронтовые медики — такого количества орденов удостаивались очень редко. Дай Бог, один-два ордена. Так что преобладающее большинство оставшихся еще в живых участников войны опять будут обделенными нашим дорогим правительством. Армейская же верхушка опять получит льготу в виде большой пенсии.

Петрова Софья Ивановна, участница войны, врач".

Строки еще из одного письма. Оно пришло из Слонима:

"Как человек, проживший большую жизнь, повидавший на своем веку всякое, скажу: ордена как на войне, так и в мирное время далеко не всем давали за подлинные ратные подвиги и личные трудовые успехи. Нередко награды получали те, кто ближе был к начальству, верно служил, угождал ему.

Вспомню фронтовые будни. В нашем 748-м тяжеломинометном дивизионе (160 мм минометы) старшиной был Семен Ф. Человек общительный, шустрый, угодный для начальства. Кормил он нас, солдат, неплохо, но больше поил начальство. Так вот за два с небольшим фронтовых месяца старшина дивизиона, фактически не видев живого немца, удостоился двух орденов Красной Звезды и ордена Славы III степени, нескольких медалей.

Те же, кто был на передовой, к концу войны получили одну-две медали.

Или еще пример из армейской жизни. Проходя после войны службу в Венгрии (Южная группировка), я встретил военного цензора окружной газеты полковника Н. У него вся грудь в орденах. В том числе два ордена боевого Красного Знамени, четыре других. Когда его спросили, где и кем воевал, то полковник не без гордости ответил: был адъютантом у маршала Захарова.

Когда царствовала КПСС, то награды направлялись в обком, а оттуда, после самонаграждений, переправлялись в горкомы и райкомы. Ну, и здесь, прежде всего не забыв про свои персоны и угодных лиц, остатки орденов и медалей расходовали на награждение тех, кто создавал своим трудом материальные блага, кормил и нес на своих плечах многотысячную партбюрократическую рать. Знаю бывшего первого секретаря горкома, который за десять лет получил четыре высоких ордена. И знаю заслуженных и первоклассных механизаторов, проработавших на земле по 25—30 лет и не получивших ничего...

Иван Чугуев, депутат Гродненского областного Совета".

...Очень сложный и больной этот вопрос — признание и оценка заслуг перед страной конкретных лиц. И не газете, разумеется, его решать. Но в любом случае должен быть исключен механический подход, базирующийся на учете формальных признаков. Знаете ли вы, например, что, согласно постановлению Совмина, пенсию за особые заслуги перед Республикой Беларусь можно выплачивать бывшему лидеру болгарских коммунистов Тодору Живкову? Почему? Потому, что он является Героем Советского Союза...

Вот обо всем этом и следовало, наверное, говорить с самой высокой в стране трибуны. А не пугать на ночь глядя телезрителей журналистом Крапивиным, который, по Н.И.Журавлеву, недоволен тем, что "белорусские мамы и папы производят на свет девочек и мальчиков с более длинными руками и ногами", который якобы стремится к тому, чтобы в стране было как можно больше "недоразвитых", к тому, чтобы их как можно больше сидело "на шее правительства". (Хотя почему, собственно, правительства? Если кто-то и сидит на шее, то это шея не правительства, а всей массы рядовых налогоплательщиков.)

Оправдываться, цитируя самого себя, — не самое привлекательное занятие. Но коль уж на меня прилюдно пожаловались, то напомню, о чем и как говорилось в газетной публикации:

"Совершенно очевидно, что в том же спорте, бывают чемпионы и чемпионы. Ну, блеснул на европейском первенстве некий юноша (есть виды спорта с таким обилием дисциплин и упражнений, что медали иногда проливаются дождем), ну, поговорили о нем какое-то время в профессиональных кругах, а потом, ввиду отсутствия дальнейших достижений, забыли. Так за что же белорусский народ должен выплачивать этому человеку весьма жирную пожизненную ренту? За то, что мама и папа когда-то произвели его на свет с ногами и руками несколько большей длины, чем у остальных людей? Спортивная медаль и некоторое количество валюты получены — вот это и есть собственно награда..."

А что, разве не так? Разве изначально спорт — это не добровольное удовлетворение собственных запросов, не занятие ради личного удовольствия? Не хочешь напрягаться на спортивном помосте — работай у заводского станка. Иное дело, если выдающийся спортсмен создает значимую для общества школу физического совершенствования, если его достижения дают прямой эффект в оздоровлении нации. Вот это и надо оценивать на государственном уровне. А сама по себе спортивная медаль — еще не особая заслуга перед белорусским народом. К слову, в юности я тоже был чего-то там чемпионом. Кажется — БССР. Кажется — по пулевой стрельбе. Но бесплатно булочек по этой причине в студенческом буфете не требовал.

О ночном офицерском преферансе и наградах "За службу" в мирное время... "Откуда такая информация?" — восклицает Н.И.Журавлев.

Докладываю: в красной папочке мне ее никто не подносил. За время офицерской службы она, что называется, сама перла изо всех щелей.

Первым командиром батальона в 120-й дивизии у меня был молодой человек по фамилии Варенников (да, сын генерала армии Валентина Варенникова). Пробыл он комбатом совсем недолго — просто надо было отметиться на должности перед поступлением в военную академию. И, видимо, по этой причине он не стремился запоминать фамилии не только сержантов, но и командиров взводов. Ко мне, подчиненному офицеру, старший лейтенант Варенников, например, обращался так: "Эй! Как там тебя... Капустин". Я поначалу удивлялся, что на учениях пищу этому молодому человеку готовили отдельно, и вкушал он ее, естественно, тоже отдельно от остальных офицеров и прапорщиков батальона. Что же за заслуги у него необыкновенные? "Ничего, еще не таких армейских чудес насмотришься", — успокоили меня более опытные товарищи.

Вот уж действительно насмотрелся! И не только насмотрелся — участвовал в этих чудесах.

Например, будучи помощником дежурного по части, развозил из штабных кабинетов по домам пьяных шлюх. А в это время часовые на стрельбище выстаивали ночью на морозе по две-три смены, потому что автомашина была занята.

В ущерб боевой подготовке личного состава участвовал в экспедициях в лесах под Полоцком и Барановичами по сбору белых грибочков с калибром шляпки не более 40 мм ("Запомните, товарищ гвардии старший лейтенант: генерал, едрить его лапоть, других не жрёть".)

Ну, а про то, как с подначальными солдатами и сержантами воровал я по приказу вышестоящего командования лес-кругляк на дачи — об этом вообще скучно рассказывать...

Такое вот было воспитание военнослужащих срочной службы, о чем сильно печется член парламента. Такие на фоне всего этого вручались ордена. И пусть простят меня, но собирательный образ "заслуженного" чиновника в погонах стоит пока перед глазами соответствующий. Если управление информации Министерства обороны Республики Беларусь поможет утвердиться иному образу, то буду признателен.

И напоследок о слове "бомбоубежище", которое сильно не понравилось депутату Н.И.Журавлеву. Для читателей, не знакомых с предыдущей статьей, делаем разъяснение посредством цитаты:

"В фантастических романах иногда обыгрывается ситуация, когда правящая элита ввиду приближающихся катастроф уходит в подземные убежища с запасами пищи и энергии, оставляя свой народ наверху. Не схожая ли ситуация у нас сейчас? Страна управляется из рук вон плохо, в экономике развал, народ нищает. Последняя "черная" хохма вот как пародирует осточертевшую всем телевизионную рекламу кошачьих консервов: "Желудок у пенсионерки меньше наперстка. А сил и энергии для давки в очередях ей требуется ох как много..." Но зато для "особых" пенсионеров строится бомбоубежище, гарантирующее при всех внешних катаклизмах сытость и тепло до скончания дней".

"Кого хотят загнать в бомбоубежище главный редактор и обозреватель "Народной газеты"?" — восклицает депутат Н.И.Журавлев. Отвечаем: мы желали бы, чтобы в том "бомбоубежище", которое сооружает для своей номенклатуры нынешний Совет Министров, могли разместиться все пенсионеры страны.

ОТ РЕДАКЦИИ. Мы понимаем, что затронутая проблема не решается ни газетной статьей, ни разовым выступлением с парламентской трибуны. Главный вопрос, думается, в способе расставления точек над "i". Кто, как и в какие сроки сделает это? Сделает так, чтобы Закон поддерживал всех действительно заслуженных граждан и препятствовал попыткам неправомерного получения привилегий.

* В качестве заголовка использованы строки из письма в редакцию минской пенсионерки Ираиды Павловны Недошивиной.

Навіны з пасольстваў

Амерыканская мара ў абмежаваных колькасцях

Як паведамляюць з пасольства Рэспублікі Беларусь у Злучаных Штатах Амерыкі, легальная і нелегальная іміграцыя захліствае, паводле ацэнак амерыканскіх экспертаў, рынак рабочай сілы ЗША і значна пагаршае магчымасці працаўладкавання нізкакваліфікаваных работнікаў.

Гэты пункт гледжання быў выказаны, у прыватнасці, прафесарам універсітэта імя Джорджа Вашынгтона Робертам Данам на праведзеным у Капітоліі брыфінгу для штатных супрацоўнікаў кангрэса і журналістаў. На яго думку, калі ЗША маюць намер перашкаджаць нарастанню няроўнасці ў становішчы сваіх грамадзян, неабходна жорстка абмежаваць прыток у краіну некваліфікаванай рабочай сілы з-за мяжы і ўстанавіць прымальныя іміграцыйныя квоты для ўезду ў ЗША кваліфікаваных спецыялістаў.

Пяць законапраектаў у гэтай сферы ўжо запланаваны для разгляду ў сенаце. На думку інфармацыйнага агенцтва ЗША, магчыма, што падтрымку большасці атрымае, напрыклад, прадстаўленае сенатарам ад штата Невада Гэры Рэйдам заканадаўства, у адпаведнасці з якім права на ўезд у ЗША штогод змогуць атрымаць не больш як 300 тысяч імігрантаў. Прычым гэта колькасць будзе ўключаць і квоты, зарэзерваваныя цяпер для бежанцаў і асоб, якія просяць палітычнага прытулку.

Новы законапраект, акрамя таго, прадугледжвае павелічэнне штата пагранічнай службы ЗША і ўвядзенне жорсткіх санкцый у адносінах да работадаўцаў, якія наймаюць асоб, што незаконна ўехалі ў краіну. Ён таксама прапануе больш сур'ёзную праверку сапраўднасці падстаў для атрымання палітычнага прытулку ў ЗША.

З жыцця прэсы

Пачакаем да сакавіка

Днямі ў штаб-кватэры СНД у Мінску прайшло першае пасяджэнне рэдакцыйнага савета новага штотыднёвіка "СНГ: общий рынок". Паводле слоў Ягора Якаўлева, галоўнага рэдактара "Общей газеты", на базе якой ён будзе выдавацца, штотыднёвік мае намер прытрымлівацца прынцыпаў жорсткага параўнальнага аналізу эканомік краін Садружнасці, пазбягаць разважанняў, браць за аснову толькі факты і дакладную інфармацыю.

Дзяржавы—удзельніцы Садружнасці ўносяць аднолькавую долю сродкаў для фінансавання выдання, але гэта толькі першы год, потым пачне дзейнічаць прынцып самафінансавання. Рэспубліку Беларусь у рэдакцыйным савеце прадстаўляе першы намеснік старшыні Дзяржэканамплана Рыгор Вячорка. Нулявы нумар штотыднёвіка "СНГ: общий рынок" мяркуецца выпусціць 100-тысячным тыражом у сакавіку гэтага года.

Ларыса КЛЮЧНІКАВА,
Белінфарм.

Цэны кусаюцца

Такі хлеб і ў рот не палезе

Доўга цяпер будуць скрэбці ў сваіх кашальках жыхары гарадскога пасёлка Узда, перш чым купяць бохан-другі звычайнага хлеба. З 25 студзеня кошт самага таннага гатунка падскочыў ажно ў 6,5 раза — да 825 рублёў. А іншага хлеба тут і не бывае. Не дачакаўшыся абяцаных датацый з дзяржбюджэту, мясцовы хлебазавод вымушаны пайсці на такую крайнюю меру, каб хоць неяк пратрымацца на плаве.

Віктар САБАЛЕЎСКІ.

Актуальнае інтэрв'ю

Генадзь ГРУШАВЫ:

"Зноў у горшым становішчы апынуліся дзеці"

Лічачы па тэлефонных званках і пісьмах, якія атрымлівае рэдакцыя, новыя правілы афармлення выязных дакументаў, што ўведзены з 1 студзеня ў адпаведнасці з Законам аб уездзе і выездзе, не сустрэнуты на "ўра" тымі, хто збіраецца ў вояж у далёкае замежжа. Людзі вымушаны чакаць у раённых і гарадскіх АВІРах сваёй чаргі на атрыманне замежнага пашпарта тыднямі. Ім не пазайздросціш, але тут можна толькі развесці рукамі — такі закон. Аднак ёсць сярод нас грамадзяне, якія не могуць чакаць нават некалькі дзён. Гаворка ідзе аб захварэўшых дзецях з раёнаў, якія пацярпелі ад чарнобыльскай аварыі, і стан іх здароўя пагражаючы. Аб іх праблемах у сувязі з увядзеннем новага закона расказаў у гутарцы з карэспандэнтам "Народнай газеты" народны дэпутат, старшыня праўлення дабрачыннага фонду "Дзеці Чарнобыля" Генадзь Грушавы.

— На жаль, новы год прынёс нам новыя праблемы. З 1 студзеня не існуе правіла, па якім грамадскія арганізацыі, у тым ліку фонд "Дзеці Чарнобыля", маглі б звяртацца з заявамі на афармленне выязных дакументаў для цэлых груп дзяцей. Да таго ж знікла структура, якая магла б гэта выконваць. Зараз усё распылена па раёнах. Адносна чарнобыльскай праграмы гэта азначае, што дзесяткі тысяч дзяцей, якія атрымалі шанц на аздараўленне, зараз павінны сваімі сіламі, праз бацькоў, займацца афармленнем. У выніку, па-першае, не атрымліваецца сфарміраваць групы, па-другое, зрываюцца графікі заезду.

— Ці маеце вы канкрэтныя прыклады, калі новыя правілы перашкодзілі паездкам дзяцей?

— Так, напрыклад, у мінулым годзе фонд "Дзеці Чарнобыля" заключыў дагавор з клінікай нямецкага горада Бернау аб тым, што мы будзем штомесячна пасылаць туды 10 цяжкахворых анкалагічных дзяцей. Фактычна гаворка ідзе пра 100—120 дзяцей у год, якіх клініка з самых гуманных намераў будзе лячыць бясплатна. Першая група павінна была ехаць 14 студзеня, аднак ад'езд быў адкладзены амаль на два тыдні з-за праблем з афармленнем дакументаў. За гэты час клініка панесла каласальныя страты, бо ўтрыманне толькі аднаго пустога ложка каштуе 400 марак у дзень. І зараз невядома, ці не адмовяцца немцы ад супрацоўніцтва з намі. Або вось самы свежы прыклад з Магілёва, дзе затрымалася група, якая яшчэ ў мінулым годзе падала дакументы на афармленне паездкі ў Аўстрыю. Зараз з іх у пашпартным аддзеле УУС патрабуюць пісьмовую згоду ўсіх бацькоў. Гэта значыць на месцах пачалася самадзейнасць чыноўнікаў, што заўсёды прыводзіць да шматлікіх праблем.

— Якія крокі вы рабілі, каб палепшыць сітуацыю?

— Хаджу па міністэрствах, інстанцыях, дэпутацкіх камісіях, пераконваю ўсіх, што для чарнобыльскіх дзяцей мы павінны стварыць "зялёны калідор". Прынамсі, ні ў каго няма пярэчанняў, але справа не рухаецца наперад. У консульскім аддзеле Міністэрства замежных спраў я прасіў часова захаваць былы парадак афармлення дакументаў для чарнобыльскіх дзяцей. Але мне сказалі, што яны гэтага зрабіць не могуць. Гутарыў з першым намеснікам міністра ўнутраных спраў Канстанцінам Платонавым, з былым міністрам Уладзімірам Ягоравым. Абодва запэўнілі, што АВІР з праблемай справіцца. Аднак, на маю думку, гэта вельмі смелая заява, бо дагэтуль там няма цэнтралізаванай службы, якая б узяла на сябе афармленне групавых заявак. Мяне падтрымалі ў шэрагу дэпутацкіх камісій па знешнеэканамічных сувязях, па галоснасці і правах чалавека і іншых. Усе прызнаюць, што гэта справа вельмі патрэбная, што варта захаваць хаця б на час былы парадак, але, як я ўжо сказаў, справа стаіць на месцы.

— Што вы канкрэтна можаце прапанаваць?

— Трэба, каб Савет Міністраў, па-першае, даў даручэнне Міністэрству ўнутраных спраў стварыць у Мінску службу, якая б узяла на сябе афармленне дакументаў для груп хворых чарнобыльскіх дзяцей. А нам каб дазволілі звяртацца ад імя гэтых дзяцей у органы МУС. Я маю на ўвазе і грамадскія, і дзяржаўныя арганізацыі, якія апынуліся ў аднолькавым становішчы. Такое рашэнне можна было б уключыць у пастанову Савета Міністраў аб увядзенні ў дзеянне дадзенага закона. Усё, больш нічога. Яшчэ раз звяртаю ўвагу на такі факт. Пад пагрозай доўгатэрміновыя праграмы аздараўлення нашых дзяцей, а гэта прыкладна 50—60 тысяч хворых дзяцей у год, з іх каля 30 працэнтаў аздараўляюцца толькі па лініі фонда "Дзеці Чарнобыля". Калі мы не вырашым нашы ўнутраныя праблемы і не зможам забяспечыць нашым партнёрам узгодненую дастаўку груп, яны страцяць вялікія грошы і больш такіх прапаноў і магчымасцей мы не атрымаем. У дадатак да гэтага рэзка скароціцца паступленне гуманітарнай дапамогі — медыкаментаў, вітамінаў, розных вельмі неабходных нам лекаў і абсталявання, якія лепш за ўсё збіраюцца там, дзе знаходзяцца на лячэнні і адпачынку нашы дзеці.

Гутарыў Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ.

Поэзия — гостья небесная

Иван ТИТОВЕЦ

Куропаты

О, Господи-Боже,
за что нас? За что же?!
И, падая, слезы
спекали песок.
А с твердою верой
и с твердою кожей
Палили в затылок,
палили в висок.

И падали в ямы
невинные люди,
Пройдя всю дорогу,
что адом была.
А вождь всех народов:
"Не то еще будет!"—
Приказывал тройкам
ускорить дела.

И тройки старались
и лезли из кожи,
Держава клепала для
них ордена.
На горе и крови,
и диком безбожьи
На свет коммунизма
катилась страна.

О, сколько
истерзано! Сколько убито!
А сколько воды
в пустоту утекло!
Все шито и крыто,
зарыто, забыто.
Да, к счастью, прозрение
к людям пришло.

Шумит газопровод
и строятся хаты,
На спрятанных трупах
синеет лесок,
И скупо слезится с берез
в Куропатах
Притоптанный кровью
и горечью сок.

Матуля

Да 80-годдзя сваёй матулі Ганны Прохараўны прысвячаю

Над тваёй
дарагой сівізною,
Мне здаецца, лунае святло
І сагрэтае шчырай душою
Вылучае спакой і цяпло.
Ад гнязда адляцеўшы,
лятаем,
І гадоў ужо шмат уцякло,
А дамоў, як раней,
запрашае
Малітоўнае гэта святло.
За сямейнаю цёплай
бяседай
Нам утульнасць
і згоду нясеш.
Ды аб нас, каб усё
табе ведаць,
Ды аб нас ты гаворку
вядзеш.
"Не сварыцеся,
дзеткі, ніколі", —
Заклінанне гаворыш сваё.
Грэюць: хата падлогай
і столлю
І святое аблічча тваё.
І лазой падпяразаны
хлопчык,
Як з тумана галечных
тых дзён,
З роднай хаты ў свет
белы пакрочыць,
І твой плач
паляціць наўздагон.

Из почты

Когда станем друг друга уважать?

Проработал я более 38 лет водителем различных автомашин. Пенсию назначили маленькую. Люди говорят: здесь что-то не то. Делай перерасчет. Начал я собирать справки за последние годы работы. Пришлось обратиться в городской кожвендиспансер, где работал водителем первого класса четыре года. Пришел в бухгалтерию, где получал зарплату, но, потратив несколько часов, не нашел в ведомостях своей фамилии. И никто не мог мне на это ничего сказать.

Пошел в Московский РИК, там есть отдел, который ведает здравоохранением. Сходил безрезультатно. Но обнадежили, сказали, что будут искать.

Прошла неделя, и я позвонил, мне в назидание ответили, что заявки рассматривают на протяжении месяца. Но по разговору понял: зачем назначать эти сроки, когда нет желания помочь другому? Ведь ничего сверхъестественного не требую. Пришел туда, где работал, получал зарплату и прошу выдать мне не льготы, а справку. Разве не прямая обязанность работников сделать это безо всяких проволочек? Но, посмотрите, нас еще и укоряют, что мы нарушаем их ритм жизни. Чего же тогда хотеть, каких перемен?

Виктор ЯРМАКОВИЧ.

ЗАМЕЖЖА

*ІТАР-ТАСС *ІНТЭРФАКС *НАРОДНАЯ ГАЗЕТА*

Пульс дня

Расія не збочыць са шляху рэформ

"Расія будзе працягваць дэмакратычныя рэформы. Мы не толькі не адступім ад выбранага курсу, але будзем імкнуцца нарошчваць тэмпы рэформ", — заявіў старшыня ўрада Расійскай Федэрацыі Віктар Чарнамырдзін у інтэрв'ю тэлекампаніі Сі-эн-эн. Ён сказаў, што Расія зараз сутыкаецца з "найцяжэйшымі праблемамі ў эканоміцы". "Мы ведаем аб гэтых праблемах і ведаем аб тым, што нам неабходна рабіць для таго, каб іх вырашыць. Зараз галоўнае — сфакусіраваць увагу на гэтых праблемах і прафесіянальна пазбавіцца іх. "Які б розгалас зараз ні хадзілі ў Расіі і за яе межамі аб палітыцы, праводзімай урадам, хачу сказаць, што мы не звернем з курсу рэформ", — падкрэсліў В.Чарнамырдзін. — Устаноўка на дэмакратыю і рыначныя адносіны ў нас у краіне незваротная".

Прадастаўляць апраўданую падтрымку...

"Мы лічым, што праграмы аказання дапамогі Расіі павінны ажыццяўляцца і далей. Мы будзем заклікаць міжнародныя фінансавыя інстытуты прадастаўляць ёй апраўданую і мэтазгодную падтрымку", — заявіў дзяржаўны сакратар ЗША Уорэн Крыстафер. Кіраўнік амерыканскага знешнепалітычнага ведамства дадаў пры гэтым, што Вашынгтон не збіраецца прапаноўваць Міжнароднаму валютнаму фонду і Сусветнаму банку пераглядзець іх крэдытную палітыку. "Мы не маем ілюзій у адносінах да цяжкасцей цяперашняй сітуацыі ў Расіі. Мы заўсёды ведалі, што не такі цярністы шлях, — адзначыў У.Крыстафер, гутарачы з журналістамі. — У гэтым працэсе будуць пад'ёмы і спады, аднак Злучаныя Штаты павінны ісці стабільным курсам, падтрымліваючы там эканамічныя, дэмакратычныя і знешнепалітычныя рэформы".

Дапамога павінна быць эфектыўнай

Злучаныя Штаты і Германія "павінны аб'ядноўваць намаганні і аказваць падтрымку рэформам у Расіі і іншых дзяржавах", якія трансфармуюць свае эканамічныя і палітычныя сістэмы. Аб гэтым заявіў канцлер ФРГ Гельмут Коль, выступаючы перад удзельнікамі канферэнцыі Нацыянальнай асацыяцыі губернатараў амерыканскіх штатаў, якая праходзіць у Вашынгтоне. Сказаўшы, што "няўдача з аказаннем дапамогі Маскве прымусіць Захад заплаціць пазней высокую цану", Г.Коль падкрэсліў залежнасць пабудовы мірнай Еўропы ад поспеху ажыццяўлення рыначных рэформ, якія ажыццяўляюць былыя сацыялістычныя краіны. Адначасова канцлер ФРГ адзначыў важнасць захавання блока НАТО як краевугольнага каменя бяспекі еўрапейскага кантынента. Асаблівае значэнне пры гэтым мае прысутнасць актыўнага амерыканскага ўдзелу ў вырашэнні еўрапейскіх праблем.

"Дыскаверы" рыхтуецца ў дарогу

На мысе Канаверал пачаўся адлік часу перад запускам касмічнага карабля шматразовага выкарыстання "Дыскаверы". Ён стартуе 3 лютага з экіпажам з шасці чалавек. У складзе экіпажа — расійскі касманаўт Сяргей Крыкалёў, які больш як год праходзіў падрыхтоўку да палёту ў цэнтры імя Ліндана Джонсана ў Х'юстане (штат Тэхас). Расійскі касманаўт будзе ўпершыню несці вахту ў якасці спецыяліста па палёту на амерыканскім касмічным караблі. Аднак супрацоўніцтва дзвюх краін у космасе мае даўнюю гісторыю. У 1975 годзе яно азнаменавалася стыкоўкай савецкага карабля "Саюз" і амерыканскага "Апалон".

Праблемы бяспекі ў наяўнасці...

Трохбаковы форум па праблемах забеспячэння бяспекі ў паўночнай частцы Ціхага акіяна з удзелам прадстаўнікоў Расіі, ЗША і Японіі адкрыўся ў Токіо. Гэты форум быў задуманы і праводзіцца як неафіцыйная сустрэча, на якой не будзе прынята ніякіх афіцыйных пагадненняў, не будзе апублікавана ніякіх заяў. Галоўны яго сэнс — дазволіць экспертам і прадстаўнікам урадаў і экспертам трох краін у канфідэнцыяльнай абстаноўцы адкрыта абмяняцца думкамі па складанай праблеме забеспячэння стабільнасці і бяспекі ў рэгіёне, намеціць шляхі наладжвання эфектыўнага трохбаковага супрацоўніцтва ў гэтай сферы, неабходнасць чаго сёння дакладна ўсведамляюць у Вашынгтоне, Маскве і Токіо.

Израильская экономика: парадоксы и чудеса

Моше ФЕЛЬВЕР

Что же это за страна — Израиль? Страна, без упоминания которой в выпусках международных новостей практически не проходит ни один день. При этом все бурные события современного Израиля развиваются на крохотном клочке земли площадью в 21 тысячу кв.км (для сравнения: территория Латвии — 64,5 тыс. кв.км), а большинство населения Израиля — 5,3 миллиона человек — иммигранты и их прямые потомки, прибывшие из ста тридцати стран света (в том числе миллион арабов — граждан Израиля).

Валовой продукт на душу населения — 12,3 тысячи долларов в год: по этому показателю Израиль занимает двадцатое место в списке из двухсот стран, однако по темпам роста валового национального продукта — более 6% в год — последние три года Израиль находится на первом месте в мире. Причем эти темпы гораздо ниже тех, что отмечались в первые десятилетия существования государства (1948—1973 гг.), когда этот показатель в среднем равнялся 10%. Израиль занимает первое место в мире и по экспорту продукции на душу населения (более 4 тысяч долларов в 1992 году); еще на большую сумму Израиль ввозит товары из-за рубежа (около 5350 долларов в год, также в расчете на душу населения).

Два последних показателя сразу же выявляют одну из самых острых экономических проблем Израиля: несмотря на быстрый рост валового продукта, импорт все еще значительно превышает экспорт. Таким образом, создается дефицит торгового баланса, составивший около 6,85 миллиарда долларов в 1992 году.

Означенный дефицит имел место не только в прошедшем году. Следует признать, что за время своего существования, с 1948 года, Израиль ни разу не имел положительного годового сальдо. Сумма всех дефицитов за эти годы достигает двенадцатизначной цифры — 100 миллиардов долларов. И все же принято считать, что экономика Израиля стабильна. Что это — чудо? Парадокс? И то и другое?

Называть это можно по-разному, но существует реальное объяснение того, что экономика при таком торговом дефиците продолжает успешно функционировать. Дело в том, что Израиль обладает недюжинным умением привлекать капитал из-за рубежа — в виде инвестиций, кредитов и пожертвований от частных лиц, деловых кругов, банков и правительств западного мира. Похоже, что аккуратность Израиля в выплате долгов обеспечила ему доброе имя в финансовом мире, и в его экономику вкладывают все новые капиталы, невзирая на нестабильную военно-политическую ситуацию в регионе.

Однако причина экономического расцвета Израиля заключается не только в умении привлечь капиталы из-за рубежа. Ведь сам по себе капитал не увеличивает производство валового продукта, свидетельством чему служат богатейшие страны мира, в которых прирост валового продукта близок к нулю. Этот рост обеспечивают люди. Правда, во многих странах третьего мира при ежегодном приросте населения в миллионы человек также не наблюдается увеличения темпов роста валового национального продукта. Экономическое чудо Израиля в том, что он сумел принять около 2,2 миллиона репатриантов (это более чем в три раза превышает численность населения страны на момент основания государства), дать им возможность влиться в производительные сферы экономики, создав благоприятные условия для привлечения капиталов. Это редчайшее сочетание быстрого роста населения и прироста капитала.

Нельзя утверждать, что основные камни преткновения убраны с пути израильской экономики. Однако все вышеизложенное без сомнения свидетельствует о том, что их удалось сдвинуть с места. Мы уже упоминали о дефиците торгового баланса — острейшей проблеме экономики государства. Но и она, можно сказать, близка к своему решению. Ведь в 1950 году объем израильского экспорта составлял лишь 14% от импорта страны, а в 1992 году этот показатель достиг 76%, несмотря на то, что существуют и другие, не менее серьезные проблемы, такие, как безработица или инфляция.

Десятипроцентная безработица — не Бог весть какой страшный показатель в западном мире двух последних десятилетий и, разумеется, вполне предсказуемый в стране репатриации. В конце концов трудно ожидать, что репатрианты на следующий день после того, как сошли с корабля (или — в наше время — с трапа самолета), найдут себе работу. Хотя в прошлом репатрианты трудоустраивались довольно быстро, сегодня этот процесс замедлился вследствие значительно большей сложности современных технологий. При этом лишь в 1991 году показатель безработицы перевалил двузначный рубеж и достиг цифры 10,6%. В 1992 году он возрос еще больше — 11,2%, но уже в первой половине 1993 года наметилась тенденция к снижению безработицы — ровно 10 процентов.

В отличие от безработицы, проблемы весьма болезненной для каждого израильтянина при всей социальной защищенности граждан, инфляция, каких бы размеров она ни достигала, практически не пробивает бреши в семейных бюджетах. Парадокс? Чудо? Нет, просто еще одно израильское изобретение, ставшее уже всеобщим достоянием. Израильские экономисты предложили использовать систему "привязки" (к индексу потребительских цен, а иногда и к иностранным валютам) всех выплат в хозяйстве — от заработной и квартирной платы до взносов в страховые и банковские сберегательные программы. Таким образом сохраняется реальная ценность всех платежей, и уровень жизни в Израиле, невзирая на ежегодную инфляцию, продолжает неуклонно расти (причем более высокими темпами, чем, скажем, в США, где инфляция гораздо ниже). Показатели инфляции увеличивались от однозначных цифр в 60-е годы до двузначных — в 70-е и трехзначных — в середине 80-х. В 1985 году, когда возникла реальная угроза четырехзначной инфляции, израильская экономика "взялась за ум", приняв на вооружение экономическую политику, приведшую к снижению темпов инфляции, и в 1992 году, впервые за двадцать два года, ее показатели вновь снизились до однозначной цифры — 9,4 процента.

И в заключение еще об одном из многочисленных парадоксов. Израиль — страна капиталистического хозяйства, однако основы ее экономического и политического уклада в течение полувека закладывались ярыми социалистами (некоторые из них были беженцами из России времен жесточайшей реакции после поражения революции 1905 года). В 30-е годы они, возглавляя почти все политические институты страны, позволили параллельно развиваться и капиталистической экономике. За двадцать лет до повсеместного прихода к власти социал-демократических и лейбористских партий на Западе и за сорок лет до создания блока коммунистических государств Варшавского договора социалисты — штурманы израильской экономики — нашли путь (которого они, правда, не всегда придерживались) развития капиталистической экономики, уживающейся с полусоциалистическим политическим строем.

Идея кибуцов (гораздо более коллективизированных, однако неизмеримо более преуспевающих, чем колхозы) родилась здесь восемьдесят пять лет назад и продолжает и по сей день привлекать огромное количество людей во всем мире. Всеобщая федерация трудящихся — профсоюз, созданный семьдесят три года назад — стал самым крупным негосударственным работодателем Израиля.

Нынешнее правительство Израиля, возглавляемое социалистической Партией труда, поставило перед собой в качестве одной из важнейших чисто капиталистическую задачу: приватизировать максимально возможное число предприятий, принадлежащих государству. Биржа ценных бумаг — символ капитализма. Но биржа, индексы которой в последние три года растут самыми высокими в мире темпами, — это именно Тель-Авивская биржа.

Иерусалиминформ.

Аграблены дом Шагала

Падвергся аграбленню размешчаны на Міжземнаморскім узбярэжжы Францыі дом Марка Шагала, які жыў у ім у апошні перыяд свайго жыцця. Як паведамляецца, злачынцы праніклі ў будынак, украўшы палотны, якія належалі пэндзлю Шагала і Анры Маціса, а таксама рэдкую ікону. Агульны кошт украдзеных каштоўнасцей ацэньваецца ў 170 тысяч долараў.

Еўнухі-садысты

Звычайная праверка на дарозе ў прыгарадзе Дэлі Фарыдабадзе дала такі нечаканы вынік, што нават індыйскія паліцэйскія, якія шмат што пабачылі, сумеліся.

Спыніўшы для дагляду аўтамашыну, у якой ехалі двое знешне нічым не прыкметных мужчын, вартавыя парадку знайшлі ў ёй вялікі мяшок, а ў ім — труп... кастрыраванага юнака. Зрэшты, непрыкметнымі былі толькі твары затрыманых, бо ад астатніх мужчын іх адрознівала адна вельмі істотная, скажам так, дэталь.

Расследаванне паказала, што 40-гадовы Чампа і 24-гадовы Моці належаць да сумна вядомай тут бандыцкай шайкі еўнухаў, якая дзейнічае на тэрыторыі шэрагу штатаў краіны. За апошнія два гады, прызналіся затрыманыя, члены банды насільна вылегчалі больш як 30 маладых людзей у Дэлі і суседнім штаце Хар'яна. Не ўсе няшчасныя перанеслі варварскую "аперацыю". Два чалавекі памерлі ад вялікай страты крыві. Апошняй іхняй ахвярай стаў юнак, якога і везлі еўнухі, каб закапаць дзе-небудзь у зацішным месцы. Астанкі другога маладога чалавека, кастрыраванага і памёршага два гады назад, знайшлі ля чыгуначнай станцыі ў Фарыдабадзе.

Рэкордная кампенсацыя за прафесійнае захворванне

Рэкордную кампенсацыю ў памеры 79 тысяч фунтаў стэрлінгаў (каля 120 тысяч долараў) атрымае брытанская машыністка ад свайго працадаўцы, які не забяспечыў ёй неабходных умоў працы, паведаміла тэлекампанія Ай-ці-эн.

Гэта самая буйная ў гісторыі Брытаніі сума, што выплачваецца служачаму, які атрымаў хранічнае прафесійнае захворванне, якое называецца тут "сіндром працяглага напружання".

47-гадовая Кэтлін Хэрыс, якая па сем гадзін штодзённа друкавала пісьмы і дакументы на электрычнай пішучай машынцы ў брытанскай службе ўнутраных даходаў на працягу 14 гадоў, у мінулым годзе была вымушана звольніцца з работы з-за пастаяннага болю ў руках і атрымала інваліднасць. Паводле сцвярджэння яе адваката, вінаватая ў хранічным захворванні адміністрацыя, што не клапацілася аб яе здароўі: рабочае месца ў машыністкі было нязручным, а перапынкі — вельмі рэдкія і кароткія.

Справа Кэтрын Хэрыс, паводле прагнозаў мясцовых аглядальнікаў, можа стаць важным прэцэдэнтам, які пагражае немалымі стратамі кампаніям і арганізацыям, якія недастаткова клапоцяцца пра супрацоўнікаў. Сіндрому працяглага напружання акрамя машыністак падвержаны іншыя служачыя, якія шмат працуюць за дысплеем або клавіятурай персанальнага камп'ютэра....

Добрыя адносіны да жывёлы, аказваецца, стратныя

Два мільярды юаняў страт, панесеных КНР у выніку забароны на выкарыстанне тыгровых касцей для вырабу цудадзейных лекаў традыцыйнай кітайскай медыцыны, нікольки не пахіснулі рашучасці ўлад пакончыць з пастаўленым сусветным супольніцтвам пад забарону промыслам.

У адміністрацыйным цэнтры правінцыі Хэйлунцзян — Харбіне спалена больш як паўтоны каштоўнейшай фармацэўтычнай сыравіны, канфіскаванай у браканьераў і гандляроў у ходзе нядаўняга рэйду.

Актыўная барацьба з даходным "бізнесам на касцях тыгра" разгарнулася ў другой палавіне мінулага года пасля пагрозы амерыканскай адміністрацыі выкарыстаць санкцыі супраць Кітая, калі тыгры будуць бязлітасна знішчацца і далей.

Разабраўшыся з паласатымі драпежнікамі, Пекін вымушаны публічна абвяргаць паведамленні замежнай прэсы аб "жорсткіх адносінах кітайцаў да мядзведзяў", жоўць якіх таксама на ўзбраенні традыцыйнай медыцыны, якая лічыць яе цудоўным сродкам пры лячэнні цэлага шэрагу захворванняў.

Дикая "охота" на стариков

В Москве участились случаи исчезновения одиноких пожилых людей, которые приватизировали квартиры.
По данным ГУВД, в столице России действует несколько десятков банд, устраивающих настоящую охоту на несчастных стариков. Выбор жертв велик: сегодня в Москве свыше 4 тысяч одиноких престарелых стали частными владельцами жилья.

В ходе расследования трех десятков уголовных дел выяснилось, что сюжеты преступлений разработаны почти по одному шаблону: к доверчивому владельцу квартиры заявляется "благодетель" (иногда — женщина) и обещает опеку и другие блага взамен на официальное оформление жилья на имя "опекуна". Само же оформление необходимых документов производится с использованием незаконных методов через подкуп должностных лиц.

Развязка таких сюжетов, как правило, трагична: от бывшего хозяина квартиры избавляются. Правда, не всем бандитам удается "спрятать концы". Число участников преступного бизнеса, арестованных за последнее время, уже достигло двух десятков.

Как показало расследование, охотники за стариками связаны "деловыми" контактами с некоторыми работниками московских паспортных столов, ЖЭКов и РЭУ.

Леонид ФАДЕЕВ.

Скандалы

Хорошо иметь 5 миллиардов долларов

Отсидев 18 месяцев в федеральной тюрьме, еще месяц в нью-йоркском отеле в качестве арестантки и, наконец, два месяца под домашним арестом в собственной роскошной квартире, вновь стала свободным человеком Леона Хелмсли, совладелица вместе с супругом Гарри империи отелей и иной недвижимости в США, которая оценивается в 5 млрд. долларов. Все, что ей осталось сделать, согласно вынесенному судом приговору, — это провести 750 часов, по 250 часов в год, на принудительных общественных работах под присмотром полицейского надзирателя. По сведениям, появившимся в печати, эти часы ей придется отбывать в приюте для детей наркоманов.

Суд над супругами Хелмсли, который начался в апреле 1988 года и продолжался свыше года, получил в США громкую огласку. Еще бы: судили одних из богатейших людей в мире, которым, кстати, принадлежит всемирно известный 102-этажный нью-йоркский небоскреб "Импайр стейт билдинг".

Чета была уличена в мошенничестве и уклонении от уплаты налогов. Выяснилось, в частности, что она списала как "деловые расходы" и поэтому не подлежащие обложению налогами средства, вложенные в строительство гигантского плавательного бассейна, танцевальной площадки и в загородный особняк о 28 комнатах. Попирая законы, Леона Хелмсли похвалялась: "Мы не платим налогов. Налоги платят только простолюдины".

Гарри Хелмсли, инвалид, прикованный к постели, был признан виновным, но от судебной ответственности освобожден по состоянию здоровья. Для Леоны, которой тогда исполнилось 69 лет, возмездие выразилось в том, что ее приговорили к 4 годам тюремного заключения, возврату утаенных налогов на 2 млн. долларов и штрафу в размере 7,1 млн. долларов. Оглашая приговор, судья Джон Уокер назидательно сказал: "Никто, каково бы ни было его состояние и общественное положение, не может стоять над законом. Ваши действия были проявлением откровенной алчности".

Когда титаны гостиничной империи, как представлялось, пали, печать дерзнула рассказать на своих страницах все, что о них думала. А телекомпания Эй-би-си припомнила, что гостиничная сеть Хелмсли была "империей беззакония и грязи" и что они обходились с персоналом настолько бесцеремонно и жестоко, что обслуга предупреждала друг друга о появлении злой хозяйки и о ее настроении.

Как только вступил в силу приговор, в дело ринулась армия адвокатов, подававшая прошение за прошением о пересмотре дела — не потому что оспаривала его справедливость, а призывая к милосердию. Их основными аргументами было: у Леоны слабое здоровье, а Гарри умрет, если рядом с ним не будет супруги. То ли эти мольбы, наконец, возымели действие, то ли свою роль сыграло состояние Хелмсли, но приговор был пересмотрен. 4 года заключения сжались сначала в 30, а затем в 21 месяц. Домашний арест в течение последних двух месяцев сводился к требованию возвращаться в апартаменты не позднее 9 часов вечера. Он, кстати, сэкономил государству 3294 доллара, как подсчитала газета "Нью-Йорк таймс", поскольку ее пребывание до этого в течение месяца в гостинице обходилось ему в 54 доллара в сутки.


Судья не грешил против истины, когда изрекал, что никто не может стоять над законом. Но закон, очевидно, исполняется по-разному для разных категорий людей. Хорошо иметь 5 млрд. долларов.

Юрий РОМАНОВ.

Шахматы

Из творчества читателей

В.Каташук (Лунинец)



Белые: Крс4, Фh3, Лс3, Сb1, Ке2 (5).
Черные: Кра1, п. а2 (2).
Мат в 2 хода.

Предлагаем вниманию любителей шахматной композиции двухходовую миниатюру, которую составил наш читатель из г.Лунинца Брестской области Владислав Каташук. Свои решения присылайте по адресу: 220013, Минск, ул.Б.Хмельницкого, 10а, редакция "Народной газеты", "Шахматы".

Претенденты определились

В Голландии состоялся первый этап отборочных матчей претендентов на шахматную корону, проводимых Международной шахматной федерацией (ФИДЕ). В нем приняли участие сильнейшие гроссмейстеры россияне В.Салов, А.Халифман, В.Крамник, А.Юсупов, В.Ананд (Индия), Ж.Лотье (Франция), Л.Юдасин (Израиль), Г.Камский (США), Я.Тимман и В.Стерен (Голландия), М.Адамс (Англия) и минчанин Борис Гельфанд. Соперники в матчах проводили по 8 партий.


Отлично провел трудный поединок с М.Адамсом, добившимся в последнее время высоких результатов в ряде международных турниров, Борис Гельфанд. Он одержал три победы при одном поражении и четырех ничьих, что определило окончательный счет матча — 5:3 в пользу минского гроссмейстера. В остальных матчах в следующий этап вышли: В.Крамник, выигравший у Л.Юдасина, В.Ананд, переигравший опытного А.Юсупова, В.Салов с подавляющим счетом — 5:1, выигравший у А.Халифмана, Г.Камский уверенно победил В.Стерена.

Массовый чемпионат

Стартовал первый этап одного из самых массовых турниров в республике — чемпионат республиканского Дворца шахмат и шашек. На старт вышли 116 шахматистов-разрядников. Турнир проводится по швейцарской системе в 7 туров. 15 победителей турнира получат право выступить в финале, который будет проведен с нормой кандидата в мастера.

Шашки

Этюд В.Сокова



Белые: Д. с7, пр. е1, f2 (3).
Черные: пр. а5, с5, f6 (3).
Выигрыш.

Выдающийся советский шашист Василий Александрович Соков (1912—1944) добился блестящих успехов не только в решении, но и в шашечной композиции. Он был автором более ста этюдов, многие из которых были удостоены высоких наград на всесоюзных конкурсах. Предлагаем вниманию любителей шашек один из этюдов прославленного мастера. Свои решения присылайте по адресу: 220013, Минск, ул.Б.Хмельницкого, 10а, редакция "Народной газеты", "Шашки".

Сохранил корону

Российский гроссмейстер чемпион мира Алексей Чижов и экс-чемпион мира Харм Виргма (Голландия) провели матч из 20 партий за звание чемпиона мира. Первая часть поединка проходила на родине обладателя короны в Ижевске, затем борьба была продолжена в Эстонии, а заключительная часть матча состоялась на родине претендента в Голландии. Борьба отличалась исключительным упорством, первые 16 партий после бескомпромиссной борьбы завершились вничью. И лишь на финише матча опытнейший Х.Виргма дрогнул, потерпев два поражения, и Алексей Чижов одержал победу со счетом 22:18 и сохранил свое звание.

Играют ветераны

В первенстве республиканского Дворца шахмат и шашек среди ветеранов по русским шашкам приняло участие 14 спортсменов, среди которых было 3 мастера спорта и 11 кандидатов в мастера. Соревнования проводились по круговой системе. Со старта лидерство захватил 55-летний мастер спорта неоднократный победитель и призер республиканских соревнований С.Гринберг. Проведя турнирную дистанцию без единого поражения, он набрал 9 очков из 11 и уверенно занял первое место. На два очка от победителя отстали мастера спорта Давид Беркович и Вячеслав Полянский.

Футбол

Упали. Очнулись. Смотрят — гипс. Полный финал!

Специальный корреспондент "Народной газеты" Игорь КИРЬЯКОВ передает из Москвы с международного турнира "Кубок чемпионов Содружества".

Вот и закончилась "экскурсия" минских динамовцев в Москву. Позавчера, закатив десяток мячей в ворота бишкекской "Алги", наша команда первой из всех участников "Кубка Содружества" собрала вещички и на своем автобусе убыла восвояси из первопрестольной. Стыдно за позорный проигрыш ферганскому "Нефтчи"? Пожалуй, да. За ту игру, которую минчане продемонстрировали в минувшее воскресенье, организаторы турнира и вовсе имели полное моральное право накостылять динамовцам по шее. Чтобы неповадно было рушить чужие замыслы.

По всем прогнозам, именно наша команда должна была играть сегодня в полуфинале с тбилисскими одноклубниками. Накануне турнира авансом раздавались места, строили планы журналисты и тренеры. И вот финал — минчане пролетели мимо полуфинала. Причем со свистом.

Без подобного рода "подвигов" история динамовского клуба обошлась лишь три месяца. Помнится, последний из них пришелся на ноябрь прошлого года, когда минчане соизволили проиграть таллиннской "Флоре" — 0:1. По прошествии отпуска и месячного подготовительного цикла "Динамо" шлепнулось на колени и перед Ферганой. Если рассматривать эти поражения по отдельности, можно, конечно, назвать их и случайными — "мяч отскакивал не туда", "поле было неровным", "выше головы прыгнул соперник", наконец, "просто не повезло". Однако в нашем случае случайности имеют свойство повторяться, а значит, мало-помалу превращаются в закономерность. Можно сказать и резче: чемпион Беларуси проиграл практически все принципиальные матчи ушедшего года. Вначале был гродненский "Неман", затем "Динамо-93", "Вердер", "Флора", теперь вот уже в году нынешнем — "Нефтчи". Привыкшие видеть на флагштоке оппонентов исключительно белый флаг, динамовцы практически утратили былые бойцовские качества и уже просто не могут работать от звонка до звонка. В ничего не значащих встречах минчане чувствуют себя королями, забывая старое андерсеновское выражение о голом короле. В минувшее воскресенье "Динамо" от души посмешило немногочисленную публику. Достаточно твердой рукой нам указали место в футбольной иерархии бывшего СССР. В прошлом году мы были вторыми, теперь — где-то десятыми.

Не надо обольщаться двузначным счетом (в последний день предварительных игр минчане, напомню, победили бишкекскую "Алгу" — 10:0). Победили — и слава Богу. Очевидно, белорусский футбол сегодня все же сильнее кыргызского...

А в полуфиналах турнира встретятся "Спартак" (Москва) — "Копетдаг" (Ашгабат) и "Динамо" (Тбилиси) — "Нефтчи" (Фергана).

Закон и я

Раздел ведет заведующий юридическим бюро "Народной газеты", кандидат юридических наук Ричард ГАЕВСКИЙ

В редакцию "Народной газеты" ежедневно поступают сотни писем, в которых подписчики и постоянные читатели просят помочь разобраться, оказать необходимую помощь, разъяснить или ответить на различные вопросы.

Особый поток корреспонденции (более 100 писем) вызван принятием и вступлением в законную силу Закона Республики Беларусь "О праве собственности на землю", по которому на практике стала осуществляться мечта большинства граждан Беларуси — иметь землю в частной собственности.

"Не могли бы вы, — пишет из Солигорска Н.А.Ребицкий, — на страницах регулярно читаемой мною и моей семьей газеты ответить на мои вопросы. Суть в следующем. Я хочу иметь земельный участок 0,1 га, расположенный возле моего дома, купленного несколько лет назад. Но как это сделать, с чего начать — не знаю. Куда ни обращался, никто толком не знает. Очень прошу разъяснить. Уверен, что ответы на эти вопросы интересуют многих граждан".

На вопросы Н.А.Ребицкого и многих других наших читателей мы попросили ответить начальника отдела Комитета по земельной реформе и землеустройству при Совете Министров Республики Беларусь, кандидата технических наук **А.В.УНУКОВИЧА.**

Уважаемый Н.А.Ребицкий, поднятые вами вопросы, как свидетельствуют письма, действительно интересуют многих наших граждан. Попытаемся ответить на них. На ваш вопрос: "С чего начать?" — разъясняем. Прежде всего четко выясните, чего вы хотите: приобрести земельный участок в частную собственность или закрепить земельный участок в пожизненное наследование? Если придете к выводу, что желаете приобрести земельный участок в частную собственность, то вам необходимо знать, что в соответствии с Кодексом Республики Беларусь о земле и Законом Республики Беларусь "О праве собственности на землю" Совет Министров утвердил "Порядок передачи в частную собственность земельных участков, предоставленных гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилого дома, ведения личного подсобного хозяйства, индивидуального садоводства и дачного строительства". Согласно этому документу вы лично, а также граждане, которые живут вместе с вами и имеют право на владение (пользование) земельные участки и желают получить их в собственность, должны обратиться с заявлением в местный Совет народных депутатов по месту нахождения земельного участка. Если земельный участок, о котором вы пишете, находится на территории сельского Совета, то заявление передайте его председателю. В заявлении необходимо указать: фамилию, имя, отчество (полностью); адрес вашего местожительства; общую площадь всех земельных участков, которые находятся у вас во владении, если у вас их несколько; цель, для которой вам были предоставлены земельные участки; площадь земельного участка, который вы желаете приобрести в частную собственность; просьбу выдать вам решение и государственный акт на право частной собственности на земельный участок.

Форма заявления имеется во всех местных Советах народных депутатов. Совет должен зарегистрировать заявление, рассмотреть его в течение одного месяца со дня поступления и вынести решение о передаче земельного участка в частную собственность. В решении указывается: площадь земельного участка, цель его предоставления, размер платы за земельный участок и срок ее внесения.

Решение о передаче земельного участка в частную собственность и схематический план его границ выдается гражданину в 10-дневный срок после принятия данного решения.

Следует знать, что составление и выдача государственного акта на право частной собственности на земельный участок производится после выполнения необходимых землеустроительных работ по измерению границ земельных участков, передаваемых в частную собственность. Выполнение землеустроительных работ и государственного акта на право частной собственности осуществляется за счет гражданина. В стоимость землеустроительных работ по измерению границ земельного участка включают затраты на выполнение следующих видов работ:

— горизонтальной инструментальной съемки границ земельного участка;

— изготовления плана землевладения с вычислением площадей контуроугодий (пашни, сада, постройки и др.);

— оформления государственного акта на право частной собственности на земельный участок.

Обращаем внимание всех читателей на то обстоятельство, что стоимость указанных работ зависит от количества земельных участков, из которых состоит землевладение гражданина. Необходимо знать, что если землевладение состоит из двух земельных участков, то применяется коэффициент 1,25; из трех участков — 1,4; из четырех и более участков — 1,6.

Какие показатели принимаются во внимание при установлении нормативной цены на земельные участки при продаже их в частную собственность гражданам?

Е.Л.ЕРМОЛАЕВ.

Логойский район.

Нормативные цены устанавливаются исходя из качества земельного участка и его местонахождения.

Невераюднасці свету

Джоні Уайт бачыць вачыма сабакі

Праз два дні пасля шаснаццацігоддзя Джоні да дому Уайтаў прыблукаў сабака, пародзісты баксёр. Поўсць на ім была брудная, бакі падрапаныя, галава звісала да зямлі. Выглядаў ён як само няшчасце. Уайты меркавалі накарміць сабаку і аддаць яго ў спецыяльны прытулак, але заўсёды лагодны Джоні катэгарычна запярэчыў. Ветэрынар, які аглядаў сабаку, сказаў, што нехта з яго страшэнна здзекаваўся.

Джон Уайт са Спрынгс Фалс нарадзіўся сляпым. Некалькі праведзеных аперацый зроку не вярнулі. Апошнюю з іх рабіў прафесар Малькольм Мак Дональд, сусветна вядомы хірург-акуліст. Калі яна закончылася беспаспяхова, ён сказаў бацькам, што цяпер разлічваць можна толькі на цуд.

Невялікі набытак, які сям'я здабыла цяжкай працай, амаль цалкам пайшоў на аплату лячэння. Бацькі разумелі, што пакінуць сыну вельмі малую спадчыну, і яму давядзецца ўладкоўвацца ў жыцці самому. Яны дабіваліся, каб ён усе хатнія справы рабіў так, як быццам бы быў відушчы.

Пад клапатлівай апекай хлопца сабака, якога назвалі Годзі, хутка ачуняў. Годзі аддзячваў яму сабачай вернасцю, хадзіў за Джоні, як цень. Палюбілі сабаку і жыхары мястэчка. Прыносілі яму смачныя кавалкі, расказвалі адзін аднаму пра розныя штучкі, якім навучыў сабаку гаспадар.

Месяцы праз два пасля таго, як Годзі прыйшоў у сям'ю, Джоні аднойчы запытаў:

— Мама, гэта містэр Блэйт прыехаў з татам на машыне?

Маці пацвердзіла, але пытанне яе шакіравала. Джоні запытаўся ў той час, калі машына яшчэ толькі пад'язджала да варотаў і містэр Блэйт не вымавіў ні слова.

Праз тыдзень Джоні знайшоў на сцяжынцы ў садзе лісток паперы.

— Паглядзі, мама, — сказаў ён, падаючы паперу. — Тата згубіў спіс пакупак. Як ты думаеш, ці купіць ён усё, што патрэбна?

У маці моцна забілася сэрца. Адкуль сын ведаў, што напісана на лістку? Аднак мужу яна нічога не сказала. Чакала, ці заўважыць ён што-небудзь. Ён заўважыў. У сэрцы бацькоў зноў запалала скрытая надзея, што да сына вернецца зрок, хоць бы часткова. Надзея, якой з навуковай безапеляцыйнасцю хацеў пазбавіць іх прафесар Мак Дональд.

Калі бацькі прама запыталі ў Джоні, ці бачыць ён што-небудзь, ён не змог адказаць. Чалавек, які ніколі не бачыў, не здольны сказаць, ці бачыць. Хлопчык растлумачыў, што не бачыць, а ведае. Больш зразумела ён апісаць свае адчуванні не мог.

Сапраўдным сенсацыяй у мястэчку стала, калі ў магазіне старога Джоя хлопчык папрасіў, каб сок яму налілі ў кубачак з малюнкам качаняці Дональда, а не з мышкай Маусам, які яму ўручылі.

Акулістычнае абследаванне, якое фінансавала багатая ўдава ўладальніка прытулку для сабак і катоў, выключыла выздараўленне, а дакладней — вяртанне зроку. Заключэнне ўрачоў стала яшчэ большай сенсацыяй. Джоні знаходзіў прадметы, пазнаваў людзей, адрозніваў колеры толькі і выключна тады, калі адначасова гэта самае бачыў Годзі. Больш таго, Джоні "бачыў" толькі тое, што ў гэты самы момант бачыў сабака. Нават тады, калі сабаку і хлопчыка раздзяляла сцяна або невялікая адлегласць.

Прафесар Джым Морган, які праводзіў абследаванне, сказаў:

— Ствараецца ўражанне, што Джоні Уайт бачыць вачыма сабакі. Бачыць толькі тое, што ў гэты момант бачыць Годзі. Калі сабака спіць або зачынены ў цёмным памяшканні ці ў яго завязаны вочы, Джоні паводзіць сябе як звычайны невідушчы чалавек. Прычына гэтай з'явы таямнічая, і я не думаю, каб у дадзеным выпадку можна было прапанаваць якую-небудзь разумную гіпотэзу. Дапускаю, што адной з прычын з'яўляецца моцная эмацыянальная сувязь паміж сабакам і чалавекам.

Гісторыя хутка стала шырока вядомай, і ў Спрынгс Фалс пачалі ехаць вучоныя, журналісты і проста шукальнікі сенсацый. Бацька Джоні праявіў нечаканыя здольнасці ў бізнесе. З кожнага журналіста ён браў грошы за інтэрв'ю і за здымак з сынам. Вельмі хутка сабралася істотная сума.

Журналіст мясцовай газеты "Спрынгс Фалс Ньюс" задаў хлопцу пытанне:

— Як ты будзеш сябе адчуваць, калі Годзі не стане?

— Пакуль што над гэтым не задумваўся, — адказаў Джоні. — Задавальняюся тым, што даў мне лёс. Адчуваю сябе як ігрок, які выйграў у латарэю, і разумею, што выйгрышу мне не хопіць на ўсё жыццё. Але гэта не перашкаджае мне радавацца яму зараз.

(Па матэрыялах замежнага друку.)

Советы доктора Куреннова

Сберечь материнское молоко

Природа так распорядилась, что в мире нет продукта, который по питательным ценностям превзошел бы материнское молоко. Потому лучший продукт для малышей, обеспечивающий их нормальный рост, развитие, оберегающий от болезней, — молоко матери. Но случается, особенно у молодых женщин, что молоко вдруг исчезнет совсем или его крайне мало для ребенка. Что делать?

Ни в коем случае не нервничайте, потому что это принесет еще больший вред. Постарайтесь спокойно проанализировать, почему именно исчезло молоко. Болезнь, неправильное питание, нервное потрясение? Если молодая мама заболела, то лучше избавиться от болезни с помощью природных способов, ни в коем случае не пить пилюли. Многие молодые мамы боятся поправиться. Что и говорить, лишний вес — плохо. Но от него вы избавитесь потом, когда не будете кормить ребенка. А пока что обязательно введите в свой рацион чай с молоком, сыр, каши, супы, борщи, овощи и фрукты. И все — в достаточном количестве для образования молока, удовлетворения им потребностей ребенка.

Хуже, если молоко исчезает из-за нервных потрясений. Но и здесь можно помочь. Покой, полноценное питание, много питья, свежий воздух, сон, отвары успокоительных трав. Рецепты этих отваров вы найдете в книге. Главное, каждая мама должна помнить, что на протяжении тех месяцев, когда кормит ребенка, ей необходимо делать все для того, чтобы сберечь достаточно молока. Ведь ее молоко закладывает в маленьком человеке фундамент здоровья, силы, красоты.

Праграма тэлеперадач

Серада, 2 лютага

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Пад купалам Сусвету.
8.20. Надвор'е.
8.30. Пяць хвілін на жарты.
8.35. "Дывертысмент". Фільм-канцэрт.
9.00. Тэлебачанне — школе. Янка Купала і яго настаўнікі.
9.25. "Ніхто, акрамя цябе".
10.10. "Маэстра, клоун і мы". Фільм-канцэрт.
10.40. Аэробіка.
11.15. Песню бярыце з сабою. "Залатая ліра".
13.30. Навіны (з сурдаперакладам).
13.40. "Загадкавы нашчадак". Мастацкі фільм.
15.50. "Сава", "Даніла і Няніла". Мультфільмы.
16.20. "Байгач". Кінанарыс.
16.40. Відзьма-нявідзьма.
17.40. Закон і мы. Урадавыя дакументы аб уласнасці на зямлю.
18.10. Абласныя навіны (Гомель).
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. "Карамболь". Ток-шоу з удзелам спявачкі Алены Камбуравай.
19.35. "Спыніся, імгненне..." Скульптар А.Дамброўскі.
20.05. Дзелавая размова. Гутарка са старшынёй Наваполацкай рэгіянальнай асацыяцыі прамыславікоў і прадпрымальнікаў Г.Р.Голубам.
20.30. Кантакт.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Пад купалам Сусвету.
21.45. Пяць хвілін на жарты.
21.50. Надвор'е.
22.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — "Ніхто, акрамя цябе"; Валейбол: "Энка" (Мінск) — "Неман" (Гродна); Беларуская асацыяцыя кіно і тэлебачання Беларусі прадстаўляе: кінарэжысёр Л.Голуб.

Канал "Астанкіна"

5.00, 8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 24.00. Навіны.
5.20. Ранішняя размінка.
5.30. Раніца.
7.45. "Школа памочнікаў". Мультфільм.
8.20. "Сарока". Дзіцячая інфармацыйная праграма.
8.40. "Кот у ботах". Фільм-спектакль.
9.30. Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
10.20. Джэм.
10.50. Прэс-экспрэс.
11.20. "Чыста англійскае забойства". Мастацкі фільм.
12.40. Дак. фільм "Рускія госці".
13.35. Й.Гайдн. Сімфонія N 24 соль мінор ("Курыца").
14.25. Прадпрымальнік.
15.20. "Мая сям'я і іншая жывёла".
15.50. Джэм.
16.20. "Лятаючы дом". Мультфільм.
16.50. Тэхнадром.
17.25. Тэлерадыёкампанія "Мір".
17.50, 20.35. Надвор'е.
17.55. Футбол. Кубак чэмпіёнаў Садружнасці. У перапынку (18.45) — Добрай ночы, малышы!
20.45. Шчаслівы выпадак.
21.50. Фільмы нашай памяці. "Сярожа".
23.30. Максіма.
0.20. Прэс-экспрэс.
0.30. MTV.

Канал "Расія"

6.00, 13.00, 19.00, 22.20. Весткі.
6.20. Патрабуюцца...
6.30. Формула-730.
7.00. Паездка Грыбаедава да Чаадаева.
7.20. Час дзелавых людзей.
7.50. Мульці-пульці. "Пінгвіняня".
8.00. Сусветныя навіны Эй-бі-сі.
8.30. "Снеданне для чэмпіёнаў".
9.00. Без рэтушы.
